

ДЗЕ ПАЧУЦЬ ПАРЭЦКІ ДУХАВЫ АРКЕСТР 4

ЖЫЦЦЁ БАГАТАЕ НА СЮРПРЫЗЫ 13




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

3 ЧЭРВЕНЯ 2022 г. ПЯТНІЦА № 107 (29729)


## КОРАТКА

• Абрад «Пахаванне стралы» правялі ў Веткаўскім раёне.



• Дні беларускага кіно пройдуць у Маскве 6—8 чэрвеня.

• Экспазіцыю работ літаратуразнаўца Вячаслава Рагойшы прэзентавалі ў НББ.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Таццяна БРАНЦЭВІЧ, намеснік міністра эканомікі:**

*«Ва ўмовах санкцыйнага ціску на Беларусь асноўную ўвагу ўрад удзяляе перш за ўсё бесперабойнай рабоце прадпрыемстваў, захаванню працоўных калектываў, павышэнню зарплат на аснове росту прадукцыйнасці працы. У той жа час прымаюцца аператыўныя меры падтрымання ўзроўню жыцця насельніцтва. У цяперашніх умовах выкананне намечаных планаў, павышэнне ўзроўню жыцця грамадзян у многім будзе залежаць ад таго, наколькі эканоміка з'яўляецца здольнай адаптавацца да бягучай сітуацыі, перабудаваць існуючыя эканамічныя сувязі і развіць новыя напрамкі дзейнасці. Вялікая ўвага ў эканамічнай палітыцы дзяржавы ўдзяляецца развіццю рэгіёнаў, павышэнню прывабнасці жыцця, працы, бізнесу, тэрыторый, размешчаных за межамі сталіцы і абласных цэнтраў, папулярызацыі сельскага ладу жыцця».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «СЫХОД З НАШАГА АГУЛЬНАГА РЫНКУ ЗАХОДНІХ КАМПАНІЙ ДАЕ НАМ ДАДАТКОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ ПА ЎСІХ КІРУНКАХ»



Фота БелТА.

**Прэзідэнт краіны сустрэўся ў Палацы Незалежнасці з дэлегацыяй Ленінградскай вобласці на чале з губернатарам Аляксандрам Драздзенкам. Падчас сустрэчы Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што сыход з рынку Саюзнай дзяржавы многіх заходніх кампаній дае дадатковыя магчымасці для развіцця па ўсіх кірунках уласных вытворчых сіл.**

«Сыход з нашага агульнага рынку заходніх кампаній дае нам дадатковыя магчымасці па ўсіх кірунках. Мы таксама гатовы актыўна ўключацца ў работу ў такіх ёмістых сектарах эканомікі, як жыллёвае, прамысловае, дарожнае і інфраструктурнае будаўніцтва, якія вы вызначылі ў якасці драйвераў эканамічнага росту свайго рэгіёна. Можам не толькі пастаўляць запатрабаваную дарожную і будаўнічую тэхніку, але і браць на сябе адпаведны падрад у гэтых галінах», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Добры прыклад узаемадзеяння — калі Ленінградская вобласць падтрымала Беларусь, выбраўшы нашых вытворцаў у якасці падрадчыкаў на выкананне работ па будаўніцтве модульных станцый водаачысткі і водападрыхтоўкі.

СТАР. 2

# АБ'ЯДНАЎШЫСЯ Ў АДЗІНАЙ СЯМ'І



planetabelarus.by

## Удзельнікам і гасцям XIII Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур

Дарагія сябры!

Вітаю вас на XIII Рэспубліканскім фестывалі нацыянальных культур.

Гэта яркая падзея сімвалізуе гістарычную пераемнасць традыцый народаў свету, адлюстроўвае адкрытую і міралюбівую палітыку сучаснай Беларусі. Аб'яднаўшы ў адзінай нацыянальнай сям'і людзей самых розных культур і веравызнанняў, мы захоўваем адвечныя каштоўнасці і звычаі, узбагачаючы адзін аднаго творча і духоўна.

Гасцінныя беларусы заўсёды адкрыты для зносін з сапраўднымі сябрамі незалежна ад іх канфесійнай і этнічнай прыналежнасці. Таму ў розныя гады форум збірае на сваёй пляцоўцы ўдзельнікаў з усіх куткоў свету, згуртаваных высакароднымі ідэямі ўмацавання культурных сувязяў, развіцця адносін паміж народамі на прынцыпах раўнапраўя і ўзаемнай павагі.

Перакананы, што і сёлетні фестываль будзе садзейнічаць умацаванню дружбы паміж дзяржавамі, аб'ядноўваць мільёны грамадзян нашай краіны ў самых лепшых імкненнях жыць у згодзе, берагчы сваю зямлю і родны дом — Беларусь.

Жадаю ўсім удзельнікам і гасцям моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

Спажывец

# ЯГАДНЫ СЕЗОН: З ПАЧЫНАМ, ЛЕТА!

## Журналіст «Звязды» пакаштавала клубніцы і чарэшню новага ўраджаю

**У гэтым годзе сезон клубніц і чарэшань на рынках краіны пачаўся пазней, чым гэта адбываецца звычайна. Але цяпер ён паступова набірае абароты. Цэны на клубніцы досыць высокія, але далей ягады будуць таннейшымі, абяцаюць прадаўцы. Чарэшні на рынках пакуль мала ў параўнанні з мінулымі гадамі, і істотнага зніжэння цэн на яе ў найбліжэйшыя дні прадаўцы не прагназуюць. Галоўныя сімвалы пачатку лета — клубніцы і чарэшня: з якіх краёў прыязджаюць яны на рынкі гэтым летам, пачым іх прадаюць і якія яны на смак? Пытаемся аб цэнах і спрабуем.**

СТАР. 3



Фота Аляксандры АНЦЭЛЕВІЧ.

ISSN 1990 — 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# «СЫХОД З НАШАГА АГУЛЬНАГА РЫНКУ ЗАХОДНІХ КАМПАНІЙ ДАЕ НАМ ДАДАТКОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ ПА ЎСІХ КІРУНКАХ»

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

«Мы зацікаўлены ў гэтых праектах. Калі вас наша работа задавальняе, мы працягнем яе на зямлі Ленінградскай вобласці. Гатовы будаваць сацыяльныя аб'екты. У планах — узвядзенне школы на 825 месцаў у Ламанасаўскім раёне. Беларускія кампаніі, якія спецыялізуюцца на ўзвядзенні прамысловых аб'ектаў, ужо ўдзельнічаюць у будаўніцтве ў Ленінградскай вобласці. Праўда, па субпадрадзе, калі будзе неабходнасць, мы гатовыя пад ключ здаць любы прамысловы аб'ект», — дадаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў губернатара з дзесяцігоддзем заступлення на гэту пасаду.

«Дзесяць гадоў — юбілей. Я хачу вас павіншаваць. Працаваць 10 гадоў на гарачым месцы ў Расіі не так проста. Гэта ўжо добры тэрмін, які вы адбылі на гэтай пасадзе. Жадаю вам поспехаў і далей», — заўважыў Прэзідэнт.

У працяг свайго віншавання ён дадаў, што Ленінградскі рэгіён вельмі развіты, патрабавальны і шматвобразны. Але ўражваюць вынікі, якіх губернатар разам з камандай аднадумцаў дабіўся ў развіцці вобласці, акцэнтаваў кіраўнік краіны.

«Супрацоўніцтва Беларусі і Ленінградскай вобласці ў рэалізацыі нашых дамоўленасцяў можа быць прыкладам таго, як неабходна супрацоўнічаць. Ваш рэгіён — наш надзейны партнёр. Вы заўсёды трымаеце слова і даводзіце пачатае да лагічнага завяршэння. Аб гэтым вельмі красамоўна сведчаць лічбы. Тавараабарот перасягнуў 700 мільёнаў долараў. Гэта вельмі высокі ўзровень», — сказаў Прэзідэнт.

Па яго словах, не збавілі тэмпаў і ў першым квартале бягучага года, ёсць рэзервы для росту.

**У 2021 годзе тавараабарот Беларусі і Ленінградскай вобласці дасягнуў рэкордных 710 мільёнаў долараў ЗША, але з адмоўным для нас сальда. Па выніках трох месяцаў сёлета сальда зноў фарміруецца мінусавым для нашай краіны, а вось тавараабарот ужо амаль 160 мільёнаў долараў. Экпартуем мы ў гэты рэгіён мяса, вырабы са сталі, будматэрыялы. Завозім канцэнтраты кавы, гарбаты, легкавыя аўтамабілі, тару з паперы, кардону, пластмасы.**

Падчас візіту, дадаў кіраўнік краіны, абмяркуюць напрамкі, па якіх можна дадаць. Тут добрыя перспектывы ў аграпрамысловага сектара.

«Хоць мы з савецкіх часоў канкурэнты, таму што ўзровень развіцця ў Ленінградскай вобласці вельмі высокі. Я памятаю яшчэ з часоў работы ў сельскай гаспадарцы: заўсёды з глыбокай пашанай прадстаўлялі, наколькі развітая ў вас племянная справа. Мы ў гэтым плане гатовы з вамі супрацоўнічаць, калі ёсць хоць малая магчымасць, купляць у вас племянную жывёлу, вопыт ваш пераймаць. Мы з задавальненнем будзем прытрымлівацца гэтага», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.

Са свайго боку ён прапанаваў новыя рашэнні ў селекцыі сельскагаспадарчых культур.

Яшчэ адным цікавым праектам Прэзідэнт назваў пашырэнне вытворчасці малька каштоўных парод рыб. «Гэта — залатая жыла, якую трэба распрацоўваць сумесна. У нас у Магілёве створана добрая вытворчая база. Пад патрэбы Ленінградскай вобласці можам кратна павялічыць аб'ёмы вырошчвання», — падкрэсліў кіраўнік краіны.

Аляксандр Лукашэнка асабліва падзякаваў губернатару за рэалізацыю вельмі важнай, знакавай справы — перадачы зямлі з пахаваннямі савецкіх воінаў, якія загінулі на Неўскім пятачку.

«Там кожны сантыметр прапітаны крывёю нашых савецкіх людзей. Там мы разам увекавечваем памяць аб Вялікай Айчыннай вайне і подзвігу нашых салдат-пераможцаў. Зараз гэта выходзіць на першы план, таму што шмат жадаючых не проста сказіць гісторыю, але і некаторыя нашы подзвігі проста забыць. Мы ні ў якім разе не павінны паддавацца на падобрыя ўлоўкі. Ведаем, што яны ад нас хочуць. Таму будзем дзейнічаць у неабходным нам напрамку. Каб не было сорамна перад нашымі сынамі, каб тыя, што прыйдуць за намі, сказалі дзякуй за гэту памяць», — дадаў Прэзідэнт.

Ён яшчэ раз запэўніў у гатоўнасці падтрымаць партнёраў у любых пытаннях. «Ведаю, што і вы са свайго боку гатовы падтрымаць Беларусь па тых галінах і напрамках, якія выклікаюць у нас цікавасць. Дзякую вам за тое, што прыехалі ў Беларусь. Вельмі спадзяюся, што гэты візіт будзе вельмі прадукцыйны. Ведайце, што мы для гэтага ўсё зробім», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

### ❍ Каментарый у тэму

**Губернатар Ленінградскай вобласці Аляксандр ДРАЗДЗЕНКА,** адказваючы на пытанні журналістаў, адзначыў, што гэты візіт з-за санкцыйнага ціску крыху адрозніваецца ад шматлікіх ранейшых.

«У мінулыя візіты мы гаварылі пра супрацоўніцтва і пра яго развіццё ў рамках бягучых праектаў. Сёння візіт іншы, бо мы ўзнімалі тэму новых магчымасцяў, што з'явіліся ў Расіі, у Беларусі, у Ленінградскай вобласці па сумесным супрацоўніцтве. Мы ўжо нарошчваем наш тавараабарот. Летась ён быў рэкордны — больш за 700 мільёнаў долараў. Сёлета мы разлічваем, як мінімум, на 30-працэнтнае павелічэнне», — заявіў кіраўнік расійскага рэгіёна.

Ён расказаў, што гаворка на сустрэчы ішла і пра новыя праекты, у прыватнасці аб прамысловай кааперацыі з «Амкадорам» у горадзе Гатчына, селекцыі насення і жывёлы, лагістыку.

«Беларусь актыўна разглядае магчымасці размяшчэння партовых магутнасцяў у партах Усць-Луга і Бронка. І, вядома, мы сёння гаварылі аб прыцягненні беларускіх спецыялістаў у галіне жыллёвага і прамысловага будаўніцтва, — дадаў Аляксандр Драздзенка. — Мы адзначылі, што ў нас расце патрэба ў шырагу напрамкаў абсталявання, інвентару, тэхнікі і тэхналогій».

Губернатар адзначыў, што наконт супрацоўніцтва ў партовым пытанні пакуль у прыярытэце камбінаваны варыянт. Па яго словах, беларускія спецыялісты паглядзелі зямельныя ўчасткі, дзе магчыма ўзвесці ўласныя партовыя збудаванні. Але таксама абмяркоўваецца выкарыстанне і існуючых тэрміналаў, якія гатовы заключыць пагадненні аб перадачы часткі партовых магутнасцяў беларускаму боку.

«Вельмі важна хутка пачаць адгрузкі, бо гэта стратэгічнае развіццё Беларусі і Расіі», — заявіў Аляксандр Драздзенка.

Губернатар адзначыў аптымістычны тон сустрэчы з кіраўніком Беларусі. «Самае галоўнае, што ў нас няма ніякага песімізму. Вы ведаеце, што ў Прэзідэнта велізарная станоўчая энергетыка. Я заўсёды здзіўляюся, што ён і нас усіх вакол па-добраму зараджае гэтай энергетыкай і аптымістычным поглядам у будучыню. Так, складана, санкцыі, але гэта мне здаецца добрым шанцам яднацца і адкрываць новыя магчымасці», — падзяліўся губернатар Ленінградскай вобласці.

Пасля размовы ў Палацы Незалежнасці Аляксандр Драздзенка правёў перагаворы з прэм'ер-міністрам Раманам Галоўчанкам. Запланаваны таксама сустрэчы з кіраўнікамі Мінскага і Магілёўскага аблвыканкамаў і пасяджэнне сумеснай камісіі па развіцці супрацоўніцтва Беларусі і Ленінградскай вобласці. Акрамя таго, дэлегацыя наведае «Амкадор», «Бабруйскаграмаш», «Бабруйскі завод трактарных дэталяў і агрэгатаў».

# «БОЛЬШ, ЧЫМ ЯКАЯ ІНШАЯ СТРУКТУРА — ДЗЯРЖАЎНАЯ, БО АДКАЗВАЕ ЗА НАЙВАЖНЕЙШЫЯ РЭСУРСЫ»

## Прэзідэнту расказалі пра работу Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў

**Аляксандр Лукашэнка абмеркаваў праблемы палявання і рыбалоўства ў краіне з Ігарам Шуневічам, старшынёй гэтага таварыства, і віцэ-прэм'ерам Леанідам Зайцам.**

«Наша важная грамадская арганізацыя «Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў» — не такая ўжо і грамадская. Верагодна, больш, чым якая-небудзь іншая структура — дзяржаўная, бо адказвае за найважнейшыя рэсурсы дзяржавы, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Таму мяне і цікавіць, што там за сітуацыя? Што неабходна, каб актывізаваць работу?»

Кіраўнік краіны адзначыў, што ведае і аб прапанове стварэння Музея палявання і рыбалоўства. «Таксама трэба паглядзець нам на гэту тэму. Калі грошай не просяць, чаму быць супраць? Неабходна пагадзіцца», — заявіў Прэзідэнт.

Звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка і на барацьбу з афрыканскай чумой свінняў. Менавіта дзікі з'яўляюцца актыўнымі пераносчыкамі гэтага захворвання жывёлы:

«Паляўнічых жадана падключыць, калі гэта трэба (да барацьбы. — **«Зв.»**). Вы ў тэме. Баяцца тут няма чаго па нейкіх механізмах кампенсацыі за здабычу дзіка. Увогуле, комплекс пытанняў, што неабходна будзе вырашыць, я хачу, каб вы мне тут выклалі», — сказаў Прэзідэнт.

### ❍ Каментарый у тэму

**Ігар ШУНЕВІЧ, старшыня Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў,** адзначыў, што дзеючыя механізмы барацьбы з афрыканскай чумой свіней паказалі сваю эфектыўнасць толькі на пачатковым этапе.

«На працягу дзевяці гадоў мы не змаглі эфектыўна выканаць задачу дэпапуляцыі дзікага кабана. Таму была прапанавана іншая схема. Ніхто не ставіць пад сумненне дэпапуляцыю, але разам з тым мы разумеем, што гэты працэс неэфектыўны і стратны для дзяржавы. Таму мы прапанавалі дазволіць паляўнічым здабываць яго і выкарыстоўваць у асабістых мэтах, купляючы ў дзяржавы па мінімальным коштэ. Кіраўнік краіны падтрымаў гэтую прапанову», — сказаў старшыня арганізацыі.

Па яго словах, такое рашэнне дасць штуршок для палявання і надасць яму эканамічны сэнс. «Гэта, на мой погляд, будзе стымуляваць да здабычы дзіка. Я ўпэўнены, гэта дапаможа больш эфектыўна вырашаць задачу памяншэння пагалоўя», — дадаў Ігар Шуневіч.

Старшыня таварыства расказаў, што кіраўнік краіны падтрымаў ініцыятыву стварэння Музея палявання і рыбалоўства, заснавання Нацыянальнай трафейнай кнігі Беларусі як краіны з багатымі паляўнічымі традыцыямі.

«Усе краіны, якія паважаюць паляванне, маюць такую нацыянальную кнігу. Мы хочам, каб у нас яна таксама была», — падкрэсліў Ігар Шуневіч.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## ААН змяніла назву Турцыі па просьбе Эрдагана

Прэс-служба Арганізацыі Аб'яднаных Нацый паведаміла аб змене назвы Турцыі ў афіцыйных дакументах.



2 чэрвеня прэс-сакратар генеральнага сакратара ААН Гутэрыша Стэфан Дзюжарык заявіла аб тым, што назва Турцыі была зменена ў адпаведнасці з просьбай Таіпа Эрдагана.

Дзюжарык сцвярджае, што офіс генеральнага сакратара ААН атрымаў ліст ад міністра замежных спраў Турцыі Меўлюта Чавушаглу, які, спасылаючыся на распараджэнне Эрдагана, папрасіў змяніць назву турэцкай дзяржавы. Паведамляецца, што з сённяшняга дня ва ўсіх афіцыйных дакументах ААН Турцыя будзе ўказвацца не «Turkey», а «Tьrkiye».

Сам Меўлют Чавушаглу растлумачыў, што гэты крок неабходны Анкары ў рамках ажыццяўлення праграмы па павышэнні міжнароднага прэстыжу Турцыі.

## Пяскоў: усе кантакты паміж Крамлём і Белым домам спынены

Усе кантакты Масквы і Вашынгтона цяпер спынены. Аб гэтым заявіў прадстаўнік Крамля Дзмітрый Пяскоў, паведамляюць РІА «Навіны».

Адказваючы на пытанне агенцтва, ці ідзе нейкі дыялог паміж бакамі, Пяскоў адказаў адмоўна. «Цяпер усе кантакты фактычна адсутнічаюць», — заявіў ён.

Раней у расійскім МЗС паведамілі аб адсутнасці магчымасцяў вырашэння нейкіх пытанняў з Вашынгтонам шляхам кампрамісаў. Такая сітуацыя склалася з-за пазіцыі ЗША.

# МІНГАРВЫКАНКАМ І АБЛВЫКАНКАМЫ ПРАВЯДУЦЬ ПРАМЫЯ ТЭЛЕФОННЫЯ ЛІНІІ 4 ЧЭРВЕНЯ

**Тэлефонныя лініі ў суботу, 4 чэрвеня, з 9.00 да 12.00, правядуць:**

**Зайчук Валянцін Міхайлавіч,** першы намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама: **80162213121;**

**Субоцін Аляксандр Міхайлавіч,** старшыня Віцебскага аблвыканкама: **80212222222;**

**Зянкевіч Кацярына Анатольеўна,** старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў: **80232331237;**

**Валяваты Юрый Мікалаевіч,** першы намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама: **80152735644;**

**Ляўковіч Сяргей Віктаравіч,** першы намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама: **80175004160;**

**Ісачанка Анатоль Міхайлавіч,** старшыня Магілёўскага аблвыканкама: **80222501869;**

**Бугроў Андрэй Аляксандравіч,** старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў: **80172224444.**

# ЯГАДНЫ СЕЗОН: З ПАЧЫНАМ, ЛЕТА!

## Камароўка: Беларусь vs Грэцыя

Клубнічны сезон адкрыўся ў Мінску нядаўна. Спачатку былі гэтыя ягады казачна дарагія, потым сталі крыху таннейшыя, цяпер — у сярэднім ад 10 да 15 за кіло ў залежнасці ад таварнага выгляду. На Камароўцы ў латках з клубніцамі горда красуецца надпіс «Беларусь». Айчынныя клубніцы, зразумела, — з самага поўдня краіны, з Брэсцкай вобласці. Замежныя «аналагі» — з Грэцыі (іншай геаграфічнай прыналежнасці гэтых ягад на мінскіх рынках заўважана не было).

Клубніцы — той выпадак, калі матывуваць «купляйце беларускае» нікога не трэба. Калі казаць аб гэтай ягадзе, усе і так ахвотна падтрымліваюць айчыннага вытворцу.

— Беларускія клубніцы купляюць з задавальненнем, — распавядае прадавец Ірына. — Яны экалагічна чыстыя, карысныя і бяспечныя. Не настолькі вялікая адлегласць, каб патрэбна была нейкая апрацоўка ягад.

Грэчаскія клубніцы, дарэчы, цяпер таннейшыя за беларускія: на Камароўцы іх прадаюць па 12 рублёў за кіло. Распаўсюджаны маркетынгавы ход — кошт 11.99.

— Грэчаскія — самыя смачныя клубніцы на рынку, — рэкламуе свой тавар малады чалавек. — А тыя, хто расказваюць вам, што клубніцы ў іх беларускія, дык там таксама палова грэчаскіх, — пакрыўджана дадае ён.

Пакупнікі нахіляюцца над латкамі: калі ёсць клубнічны водар, верыць, што клубніцы беларускія. Грэчаскія — прыгожыя, «пластыкавага выгляду» і зусім не пахнуць. Зрэшты, буйныя беларускія клубніцы — такія ж прыгожыя, глянцавыя і таксама не маюць водару. Затое дробныя (у параўнанні з адборнымі волатамі па 15-16 рублёў за кг), звыклага віду «з бабулінага агарода» (пра іх кажуць — «грунтавыя ўжо») выпраменьваюць выразны клубнічны водар. Ды яны і таннейшыя — у сярэднім па 10—12 рублёў за кілаграм. Іх і бяруць больш за ўсё.

— У мяне і грэчаскія, і беларускія клубніцы, — распавядае прадавец. — Гэта брэсцкія, цяплічныя. Дам пакаштаваць. Грэчаскія — вельмі салодкія. Нашы першыя беларускія ягады салодкімі не бываюць. Яны з кіслінкай, хлусіць не буду. Але яны ж першыя! Я вам па сакрэце скажу, дзяўчынкі, — паніжае голас прадаўшчыца і нават трохі нахіляецца да нас з-за высокага прылаўка. — Гэта на рынку першыя беларускія ягады. Тое, што да гэтага прадавалі і казалі «брэсцкія», былі не беларускія клубніцы.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



**Прыехала чарэшня сёлета на беларускія рынкі ў асноўным з Узбекістана, хоць ёсць і ягады з Таджыкістана, а таксама азербайджанскія.**

Спрабаваць на Камароўцы клубніцы даюць, але не так, як раней — ягадамі, а ма-а-аленькімі кавалачкамі: ягадку рэжуць вострым нажом так, што адной хапае «на пакаштаваць» дзясятку пакупнікоў. Але, улічваючы цэны, і на тым дзякуй. Сапраўды, грэчаскія вельмі салодкія, беларускія — кісьлаватыя.

У сярэднім цэны, як ужо гаварылася, на айчынныя клубніцы 12—15 рублёў за кіло, хоць ёсць вельмі буйныя ягады нават па 18 рублёў за кілаграм і дробныя па 10. Рынак ёсць рынак — заўсёды можна знайсці танней.

— Такія клубніцы мы прадавалі па 14, але гэтая партыя сёння прыехала месцамі падушаная, транспарціроўка няўдала прайшла, таму прадаём па 10.99 за кілаграм.

Да прылаўка — чарга. Станаўлюся ў хвост: можна выбраць латок з зусім цэлымі, непадушанымі ягадкамі.

Прадавец распавядае, што, нягледзячы на дарагоўлю клубніц, людзі купляюць: у дзень сыходзіць і 40, і 50 скрынь ( у кожнай тры кілаграмы).

## Фермеры: будзе танней

Калі на Камароўцы асаблівай дэталізацыі паходжання клубніц няма — у асноўным на цэнніках пішуць «Беларусь» або «Брэст», на Заходнім рынку, куды прывезлі ягады прыватнікі, можна дакладна даведацца пра мясцовасць, дзе яны выраслі: на цэнніках пішуць «Камянец», «Лунінец», «Столін», а часам і назву канкрэтнай вёскі, аграгарадка ці хутара. Пакаштаваць тут даюць больш шчодра. Ды і самі прадаўцы ў чаканні пакупнікоў (раніцай у будні дзень іх няшмат) не-не ды і кінуць у рот клубнічку. Свой жа тавар, сам вырасціў, сам прадаеш, вось і ясі колькі хочаш. І нехк адразу ўзнікае жаданне таксама купіць сабе скрыначку.

На Камароўцы прадаюць у асноўным ягады ранняга сорту «Альба», у фермераў — значна большая сартавая разнастайнасць. Як, зрэшты, і цэнавая: атрымалася нават знайсці зусім дробныя (але, дарэчы, салодкія) клубніцы па 5 рублёў. Праўда, не за кіло, а за 800 грамаў: больш у прадаўца не было.

— Даражэнькія мае, каштуйце, калі ласка. Дамашнія ягадкі! — напеўна запрашае дзяўчына на прыгожай беларускай мове. Сярод звыклай вуху гараджаніна рускай гаворкі яе чуеш адразу. Зразумела, падыходзім да яе прылаўка.

— Гэта сорт «Амелія». Проста бомба! — бойка рэкламуе свой тавар дзяўчына. — Пакаштуйце, я вам ягадку памыю.

— Я, можа, яшчэ не куплю...

— Усё роўна пакаштуйце, каб ведалі, якія на смак. А вось гэта «Альба» для параўнання. Мы яшчэ трэці сорт возім, «Сунічны». Але яго ўжо разабралі.

— А адкуль возіце?

— Брэсцкая вобласць, Столінскі раён, аграгарадок Белавуша. Там у нас хутар, каля Белавушы. Мама і цётка займаюцца, мы з братам возім і прадаём. Яшчэ агурочкі возім — вунь там прылавак, можаце падысці купіць.

— Клубніцы ў вас цяплічныя?

— Усе пакуль цяплічныя, — шчыра прызнаецца дзяўчына. — Дзе ж яны ў адкрытым грунце выспеюць, сонца ж яшчэ не было! У адкрытым грунце ў нас такія ж па памерах ягады звычайна вырастаюць. Яны, дарэчы, у адкрытым грунце заўсёды саладзейшыя. Але ў гэтым годзе я наогул не ведаю, што там будзе: у адкрытым грунце ягады толькі завязаліся. Мы ў мінулым годзе вазілі клубніцы ў Мінск з 10 мая. А ў гэтым стаю на рынку ўсяго тры дні. А ўжо канец мая, заўтра лета! — уздыхае сураразмоўца.

Наогул, клубніцы, распавялі фермеры, недалюбліваюць спякоту. Самыя салодкія ягады — тыя, што спеюць паступова, павольна назапашваючы цукры і вітаміны. Галоўнае, каб яны паспелі выспець, а не пачалі гніць на градцы.

— Цяпер пайшлі дажджы, клубніцы на кусце не паспяваюць выспець, пачынаюць гніць. Што паспяваем выбраць, тое і прадаём. Дажджы нам вельмі перашкаджаюць. І цана з-за гэтага атрымліваецца такая. У мінулым годзе па 8 рублёў клубніцы прадавалі!

Заадно прадавец прапануе буякі. Садовыя буякі, дарэчы, таксама ўжо паўсюдна ёсць у продажы, буйныя і вельмі салодкія. Але па касмічных цэнах.

— 10 рублёў шкляначка, 70 рублёў кілаграм. Гэта першыя, таму такія дарагія. Каштаваць можна. Будзеце купляць — зраблю любую вагу.

Суразмоўніца кажа, што і буякі, і клубніцы ў найбліжэйшыя тыдні патаннеюць. З'явіцца больш грунтавых клубніц.

— Яны будуць ужо «сапраўдныя», такія, як мы ўсе прывыклі з дзяцінства. Тады і на варэнне можна будзе купляць. Гэтыя ж клубніцы пакуль першыя. Цэны абавязкова будуць падаць! — запэўнівае яна.

## У падземным пераходзе: на бягу

Клубніцы на трасах або ў пераходах метро часцей за ўсё з тых жа рынкаў, проста іх купляюць оптам на досвітку і потым на працягу дня прадаюць з аднаму толькі прадаўцу вядомым дабавачным коштам. Калі клубніцы вязуць здалёк, каб захаваць таварны выгляд, часам могуць выкарыстоўваць кансерванты. Не пераблытаць айчынныя ягады з прывезенымі з іншых краёў у прынцыпе можна па вонкавым выглядзе, але часам лепш папрасіць дакументы на прадукцыю. Хоць калі вы набываеце ягады ў пераходзе або на прыпынку грамадскага транспарту, з гэтым могуць узнікнуць праблемы — у людзей, што бягуць міма, няма часу і жадання спрачацца наконт нейкіх паперак з прадаўцамі, што сядзяць каля кардонных каробак з таварам. Прасцей паверыць на слова.

— Адкуль клубніцы? — пытаюся ў мужчыны каля выхада са станцыі метро. Малюсенькая паўза. І чаканы адказ:

— Брэсцкія.

Ці апрацаваныя ягады хімікатамі, адгадаць толькі па іх вонкавым выглядзе наўрад ці ўдасца. Але можна зразумець па ўскосных прыкметах. Напрыклад, купляючы клубніцы, у першую чаргу звяртаем увагу на латок. Калі сезон у разгары, клубніцы відавочна не ехалі на рынак здалёк, і наша задача — купіць досыць цвёрдыя ягады. Калі на сценках латка ёсць кавалачкі раздушаных ягад, такія клубніцы не бяром. Пакуль жа — парада дыяметральна супрацьлеглая.

— Трэба паглядзець на дно латка або скрыні, — навучаюць мяне прадаўцы на Заходнім рынку. — Нават вельмі свежыя «нармальныя» клубніцы пад ціскам верхніх ягад выдзяляюць некалькі кропелек соку.

Калі дно абсалютна чыстае, з клубніцамі нешта нячыста: альбо яны на смак зусім «гумавыя» і не сакавітыя, альбо ягады апрацавалі для захаванасці, распавялі на рынку. Выбіраючы латок з клубніцамі, памятаем: ягад з гнілым бачком у ім быць не павінна. Нават адна падгнілая ягадка заразіць астатнія клубнічкі.

## Чарэшня: цэны кусаюцца!

Гандлююць ужо і чарэшняй. Прыехала яна сёлета на беларускія рынкі ў асноўным з Узбекістана, хоць ёсць і ягады з Таджыкістана, а таксама азербайджанскія. Цэны кусаюцца. Мінімальная — 14 рублёў за кіло (на Камароўцы), максімальная — 25. За 18-19 дакладна можна купіць. Па чарэшню лепш ісці на буйны рынкі, на маленькіх ягады будуць даражэйшыя. Яно і зразумела: у нас чарэшня асабліва не расце, і фермеры яе не прывязуць. Пакупнікі капрызяць.

На Камароўцы чарэшню можна пакаштаваць.

— Салодкая, цвёрдзенькая! Каштуйце! Прадам нават паштучна: рубель — ягадка, — жартуе прадавец.

Дарэчы, для захаванасці чарэшні і надання таварнага выгляду часам могуць быць выкарыстаны не занадта карысныя для здароўя хітрасці. Прыйшоўшы дадому, некалькі ягад заліце цёплай (амаль гарачай) кіпячонай вадой. Плёнка на паверхні — сведчанне наяўнасці кансервантаў. Каб пазбавіцца ад іх, можна замачыць ягады ў растворы соды (чайная лыжка на літр вады) на 5—10 хвілін. Выбіраць чарэшню прадаўцы раяць па «хвосціках» — тыя павінны быць зялёнымі, а не карычневымі, і «жывымі», а не сухімі. Ягадкі аднаго сорту павінны мець аднолькавую афарбоўку. Калі ягадка святлейшая — ягадка цямнейшая, чарэшню здымалі няспелай, і даспявала яна ўнутры фуры або на складзе.

Чарэшня асабліва багатая на антыаксіданты, пры тым, што цукру і вугляводаў у ёй практычна няма. Дадайце да гэтага шырокі спектр вітамінаў, вялікую колькасць жалеза і здольнасць пазбаўляць ад ацёкаў — і атрымаеце ідэальны варыянт для пахудзення. Праўда, «чарэшневыя» разгрузачныя дні сёлета звязаны з такімі выдаткамі, што лепш (танней) харчавацца паўнавартасна. Акрамя таго, варта памятаць, што чарэшня — алерген. Так што дарослым лепш не перавышаць норму — 400 г гэтых ягад у дзень, ды і дзяцей перакормліваць такім «вітамінам» не варта.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ**, **фота аўтара.**

Надвор'е

# НА ВЫХАДНЫЯ — ДАЖДЖЫ З НАВАЛЬНІЦАМІ, АЛЕ ЦЁПЛА

## Сіноптыкі абяцаюць, што з панядзелка будзе яшчэ і сонечна

**З першых дзён каляндарнага лета нябесная канцылярыя злітавалася над намі і прынесла доўгачаканае цяпло. Праўда, цяпло будзе сябраваць з воблачнасцю і кароткачасовымі даждамі. Месцамі летнія дажджы з навальніцамі, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У пятніцу ў разгар дня месцамі па паўночным захадзе магчымыя невялікія дажджы. У ранішнія гадзіны ў асобных раёнах чакаецца туман. Вецер заходні 4—9 м/с, месцамі парывы ўзмоцняцца да 14 м/с. Максімальная тэмпература паветра днём складзе 18—23 градусы вышэй за нуль.

Потым прырода зробіць невялікую перадышку — у суботу ўначы будзе без ападкаў. Удзень месцамі па краіне чакаюцца кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Уначы і раніцай у асобных раёнах магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 5—10 цяпла, удзень — ад плюс 20 градусаў да 26 цяпла.

Затое ў нядзелю нас падмочыць грунтоўна. У гэтыя суткі на большай частцы тэрыторыі Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі чакаюцца навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 7 цяпла да 14 градусаў вышэй за нуль, днём тэмпература будзе плюс 16—22 градусы.

Паводле папярэдніх прагнозаў, у пачатку працоўнага тыдня атмасферны ціск пачне расці, і істотных ападкаў па краіне не чакаецца. Ночы ў Беларусі будуць станавіцца ўсё цяплейшыя, а дзённы прагрэў працягне павялічвацца. У панядзелак і аўторак пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца туман. Тэмпература ноччу складзе ад плюс 6 да плюс 13 градусаў, а ўдзень — 20—26 градусаў вышэй за нуль.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Краявіды, Радзівілы і футбол — фестываль «Вытокі» пройдзе ў Століне

**Няхай пакуль лета не радуе цёплым надвор'ем, але праводзіць першыя летнія выхадныя дома таксама не лепшы варыянт. Тым больш калі іх можна правесці цікава і актыўна — у Століне з 3 да 4 чэрвеня пройдзе чарговы культурна-спартыўны фестываль «Вытокі». Падарожжа ўглыб беларускага Палесся, самабытны горад і мноства спартыўных лакацый. Чым не нагода пабудаваць маршрут у Брэсцкую вобласць!**



Столін — горад на беразе ракі Гарыні, прытока Прыпяці. За сваю гісторыю, якая пачынаецца з 1555 годзе, ён шмат чаго бачыў. І ўсё гэта памятае, таму акцэнт на культурнай спадчыне, які сёлета робяць арганізатары фестывалю, тут будзе вельмі яркі. Асобнай увагі заслугоўвае назва горада: існуе аж тры версіі, чаму Столін так называецца. Першая казачная: па легендзе, калісьці на месцы горада было вялізнае возера, у якім вылавілі сто лінёў. Другая больш празаічная: у даўнія часы каля горада затанула баржа, і выцягвалі яе з дапамогай моцных вяровак — лінёў, якіх, як можна здагадацца, было сто. Трэцяя версія рамантычная: на рацэ Гарыні размяшчалася дванаццаць гарадоў, якімі кіравалі сем князёў. Іх месца збору для агульных пасяджэнняў, нарад, тобок стол, быў на месцы сучаснага Століна, адсюль і назва.

Сучасны Столін — вельмі цікавы для аматараў настальгічнага турызму. А калі наведаць не толькі горад, але і раён, можна пазнаёміцца з непаўторным беларускім Палессем. Напрыклад, у вёсцы Цераблічы аматары мастацтва адкрыюць для сябе выдатныя драўляныя скульптуры, выкананыя майстрам Іван Супрунчыкам. У вёсцы Гарадная можна пазнаёміцца з ганчарным рамяством, спакон веку тут жылі таленавітыя ганчары. Сучасныя жыхары і сёння захоўваюць і працягваюць традыцыі сваіх продкаў. А тым, хто хоча на свае вочы ўбачыць непаўторную палескую прыроду, варта завітаць на экалагічную сцежку ў Альманскіх балотах. Пакуль гэты турыстычны напрамак толькі развіваецца. На жаль, не ўсе ведаюць ці не разумеюць, наколькі цікавае Палессе. Каб гэта выправіць, Нацыянальнае агенцтва па турызме арганізавала выязны семінар па Брэсцкай вобласці і прэзентавала турыстычны маршрут «Да берагоў Гарыні і Прыпяці» (падрабязнасці семінара — у найбліжэйшых нумарах «Звязды»). Гэты маршрут распрацаваны ў рамках пілотнага праекта «Турысцкі рэгіён Прыпяцкае Палессе». Кожнаму беларусу варта ведаць, што ж такое на самай справе Прыпяцкае Палессе, бо гэта неад'емная частка краіны і яе гісторыі. І фестываль «Вытокі» таксама ў гэтым дапаможа.

Праводзячы свае выхадныя ў Століне, абавязкова трэба завітаць да руін сінагогі. Яна пабудавана ў далёкім 1792 годзе ў стылі барока, гэта рэдкі помнік сінагагальнай архітэктуры XVIII стагоддзя. Нават па руінах можна ўявіць, наколькі шыкоўным калісьці быў гэты будынак. На сценах захаваліся рэшткі традыцыйнага роспісу. Праўда, убачыць іх няпроста. Каб захаваць тое, што засталося, вокны і іншыя праёмы, праз якія можна прайсці ўнутр, закрылі дошкамі. Шмат вякоў разам з палешукамі ў Століне жылі яўрэі. У канцы XVIII стагоддзя сюды пераехаў сын вядомага хасідскага цадзіка Аарона І з роду Пярловых. Столін стаў «сталіцай» палескіх хасідаў. Дому равіна, што знаходзіцца побач, пашанцавала больш, чым сінагозе: захаваўся, яго адрамантавалі. Праўда, па прызначэнні сёння не выкарыстоўваецца.

Вуліца Пінская прывядзе да былой кірмашнай плошчы. Тут захавалася старажытная планіроўка вуліц з невялікімі дамамі. Калі падключыць фантазію, можна ўявіць, як калісьці выглядаў Столін.

Падчас канцэртнай праграмы фестывалю «Вытокі» арганізатары абяцаюць ажывіць адну з самых цікавых старонак гісторыі горада. У Століне аддадуць даніну павагі Радзівілам. Гэты знакаміты род не абмінуў сваёй увагай палескі горад. І сведка таму — парк «Манькавічы». У XVI стагоддзі пры Мікалаі Радзівіле Чорным была заснавана Давід-Гарадоцкая ардынацыя Радзівілаў. Але да XIX стагоддзя яна не мела сваёй рэзідэнцыі. Гэта трэба было выпраўляць. Выбар упаў на маляўнічае месца на высокай тэрасе, прыпаднятай над Капанцам (старарэччам Гарыні) у маёнтку Манькавічы. Дарэчы, гэтая тэраса — яшчэ адна славутасць Століна. На раўнінным Палессі вельмі рэдка сустрэнеш такую асаблівасць рэльефа. Шыкоўны парк у 1885 годзе заклала княгіня Марыя Дарота дэ Кастэлян, жонка Антонія Радзівіла. Сёння яе імя і год заснавання парку захоўвае вялікі закладны камень. Парк у Століне нагадвае парк у Нясвіжы, месца надзвычай рамантычнае. Стары дуб, узрост якога больш за 200 гадоў, указвае на месца, дзе калісьці стаяў палац Радзівілаў. Палац быў пабудаваны для Станіслава Радзівіла ў стыле неабарока італьянскім архітэктарам Венцэлем. Пасля гібелі князя рэзідэнцыя перайшла да яго пляменніка Караля Радзівіла. Той быў вялікім аматарам палявання. Дзякуючы яму, у палескіх лясах каля Століна адпачывалі і палявалі многія арыстакраты Польшчы і Еўропы. Княжацкае паляванне каля Століна было знакамітае на ўсю Еўропу. У 1943 годзе палац згарэў, гітлераўцы вывезлі арыгінальную літую браму парку. На шчасце, сам парк захаваўся. І сёння ў ім растуць 125-гадовая лістоўніца, серабрыстыя ліпы, канадскія елкі, чырвоны дуб і іншыя экзатычныя дрэвы, прывезеныя сюды з розных канцоў свету. На тэрыторыі парку працуе мясцовы краязнаўчы музей. Яго экспанаты расказваюць гісторыю Століна: ад побыту вясковых палешукоў да раскошы мясцовых арыстакратаў.

## «На Палессе трэба ехаць»

Існуе стэрэатып, што гарады, далёкія ад сталіцы ці абласных цэнтраў, не маюць чаго паказаць. Але з кожным днём, з кожным святам гэты стэрэатып рушыцца. Спалучыўшы багатую гісторыю і актыўнае сучаснае, «Вытокі» пакажуць, наколькі Столін цікавы. «Мы вельмі ўзрадаваліся, калі даведаліся, што «Вытокі» будуць праходзіць у нас. Горад узмоцненымі тэмпамі рыхтуецца, каб паказаць, што ў нас таксама цікава. З дапамогай гэтага фестывалю мы хочам даказаць, што на Палессе трэба ехаць, што тут ёсць, на што паглядзець», — адзначыў **Андрэй БУЯН, старшыня Столінскага раённага фізкультурна-спартыўнага клуба.**




Алімпійскі квэст, які пройдзе 4 чэрвеня, будзе складацца з 22 спартыўных лакацый. Напэўна, самай папулярнай з іх будзе футбольная. Гэтая гульня ў Століне ў вялікай пашане. Па словах Андрэя Буяна, не паспяваюць столінскія дзеці навучыцца хадзіць, як ужо імкнуцца біць нагой па мячы. «У мінулым годзе наша каманда Столінскага раёна перамагла ў турніры «Скураны мяч». Мы чатыры гады да гэтага ішлі, кожны раз былі побач з п'едэсталам і ў мінулым годзе нарэшце сталі пераможцамі. У нас таксама любяць і іншыя гульнявыя віды: баскетбол, валейбол», — расказаў ён.

Акрамя традыцыйных для Століна відаў спорту, будуць прадстаўлены і незвычайныя. Зацікавіць стэнд па пажарна-ратавальным спорце. У Столін прыедзе гонач ны грузавік каманды «МАЗ-СПОРТ-аўта», а таксама будзе працаваць інтэрактыўная зона VOKA Games з развіццёвымі камп'ютарнымі гульнямі. На свята завітаюць знакамітыя беларускія спартсмены.

Тых, хто спортам не захапляецца, не пакіне абыякавым паказ калекцый адзення праекта «Роднае моднае» ад беларускіх прадпрыемстваў, дызайнераў і прадпрымальнікаў. Можна паслухаць добрую музыку ў выкананні зорак беларускай эстрады і таленавітых маладых вакалістаў.

На Палессі заўсёды ўмелі добра праводзіць святы і сустракаць чаканых гасцей. Каб у гэтым упэўніцца, варта прыехаць на «Вытокі» ў Столін. А пасля — наведаць і яго ваколіцы.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**
*г. Столін.*

# ПАД ГУКІ ФЛЕЙТЫ І ТРАМБОНА

## Карнавальнае шэсце з аркестрам «Porechie VIP Band» — хэдлайнер Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур у Гродне




**Так склалася, што духавы аркестр Парэцкай дзіцячай музычнай школы вядзе за сабой фестывальную калону. Сёлета аркестр падрыхтаваў праграму, якую прадставіць на Рэспубліканскім фестывалі нацыянальных культур на Аўгустоўскім канале. А зусім нядаўна калектыў стаў пераможцам IV Міжнароднага фестывалю духавой музыкі «Беларускія фанфары», які прайшоў у Баранавічах. Аб узроўні музыкантаў сведчыць і такі факт: палова ўдзельнікаў — а гэта 25 чалавек — з'яўляюцца стыпендыятамі спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі.**

Сустрэцца з калектывам давялося напярэдадні фестывалю нацыянальных культур. Літаральна за некалькі дзён да свята тут, на малой радзіме, у аграгарадку Парэчча, аркестр прымаў віншаванні з 30-гадовым юбілеем. Сабраўся амаль увесь пасёлак. І не дзіва. Аграгарадок сапраўды музычны.

Як расказаў **кіраўнік аркестра Валерый САК,** кожны трэці школьнік у аграгарадку — яшчэ і вучань музычнай школы. Праўда, не ўсе яны ўдзельнікі аркестра, але за гады яго існавання праз аркестр прайшлі дзесяткі мясцовых школьнікаў. Ды і як не ганарыцца калектывам, які лічыцца адным з найлепшых аркестраў краіны. **Пётр МАЗЮК, выкладчык музыкі і другі кіраўнік аркестра,** чуў, як у высокіх музычных кулуарах падрыхтоўку музыкантаў у аграгарадку называюць «парэцкай кансерваторыяй».

А пачалася гісторыя аркестра з прыезду сюды двух сяброў-музыкантаў.

— Мы з Валерыем Сакам разам вучыліся ў музычным каледжы ў Гродне, пасля ён прыехаў па размеркаванні сюды, у Парэчча, а я пайшоў у армію, — распавядае Пётр Мазюк. — Паколькі я сам родам з Парэчча, Валерый запрасіў мяне на працу сюды ў школу, хоць я не імкнуўся быць педагогам. Мяне вабіла работа ў ваенным аркестры. Але Валерый змог пераканаць. І мы вырашылі «замуціць» тут аркестр. Напачатку было складана. Мала хто хацеў займацца на духавых інструментах, ледзьве набралі дзесяць чалавек на пачатку вучэбнага года. У 1992-м адбыўся наш дэбют.

— Мы часта ездзім на конкурсы салістаў, многія аркестры нават не выстаўляюць сваіх, бо ведаюць, што шанцаў няма. У нас трубачы даволі моцныя, яны пастаянна перамагаюць на рэспубліканскіх і нават міжнародных конкурсах, — дапаўняе свайго калегу Пётр Мазюк.

Але самае яскравае відовішча — гэта, вядома, марш і дэфіле. Менавіта аркестр задае тон руху ўсёй калоны падчас урачыстага шэсця. Таму тут у першую чаргу звяртаюць увагу на зладжанасць. Трэніроўкі даволі жорсткія. «Страявой» падрыхтоўкай аркестр займаецца пастаянна на школьным стадыёне. Усе рухі адпрацоўваюцца да аўтаматызму.

Сярод шматлікіх дыпломаў і ўзнагарод ёсць некалькі з фестывалю нацыянальных культур. Напрыклад, на мінулым XII форуме калектыў атрымаў дыплом «За актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні заключных мерапрыемстваў». Выступае аркестр і з асобнай праграмай. Па словах Пятра Мазюка, музычныя творы розныя, але аддаецца перавага беларускім кампазітарам. Ёсць у рэпертуары цікавае папуры на тэмы песень «Песняроў» пад назвай «Беларускія кружалі» ў аранжыроўцы Леаніда Брагінскага. Дарэчы, ён вучыўся разам з кіраўнікамі парэцкага аркестра.

Напрыканцы размовы цікаўлюся, чаму ў назве аркестра ёсць слова «VIP». Няўжо прызначаны толькі для спецыяльнай аўдыторыі? Аказалася, гэты першыя літары імёнаў кіраўнікоў — Валерый і Пётр. А што датычыцца публікі, яна самая розная. Выступленні духавога аркестра можна ўбачыць на буйных святах рэгіёна. Часта выступаюць у сваім аграгарадку Парэчча. Калектыў выязджае з канцэртамі і ў малыя вёскі. А на фестывалі нацыянальных культур выступіць з новай праграмай на Аўгустоўскім канале ў нядзелю, заключны дзень XIII Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# З РОЗНЫХ КРАІН СВЕТУ

**У праграме Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур, які праходзіць у Гродне, — круглы стол «Адзінства культур і літаратур: Беларусь — пляцоўка міралюбства». Мерапрыемства праходзіць сёння, 3 чэрвеня, на пляцоўцы Гродзенскай абласной бібліятэкі імя Я. Карскага.**

Арганізатары — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Саюз пісьменнікаў Беларусі, Гродзенская абласная ўніверсальная бібліятэка імя Я. Карскага, Выдавецкі дом «Звязда». Удзел у рабоце круглага стала ў фарматах афлайн і анлайн прымаюць пісьменнікі Беларусі, у прыватнасці актыў Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі і літаратары замежных краін — Расійскай Федэрацыі, Казахстана, Азербайджана, Узбекістана. Расійскую пісьменніцкую супольнасць прадстаўляць кіраўніцтва Саюза пісьменнікаў Расіі, паэты, празаікі, кнігавыдаўцы з Марый Эл, Татарстана, Башкартастана.

Да абмеркавання прапанаваны наступныя пытанні: роля Рэспублікі Беларусь у наладжванні і развіцці культурных кантактаў; канцэптуальныя пытанні, прыярытэтныя кірункі і формы гуманітарнага супрацоўніцтва; умацаванне літаратурных сувязяў як сродак супрацьстаяння негатыўным выклікам сучаснасці; роля інфармацыйных тэхналогій у захаванні адзінай гуманітарнай прасторы; пераклад літаратурных твораў як сродак умацавання ўзаемаразумення і братэрскага суіснавання народаў.

**Сяргей ШЫЧКО.**

# «ШУРЫК СУПРАЦЬ ШУРЫКА»

**На тэлеканале АНТ 4 чэрвеня адбудзецца паказ дакументальнага фільма з аднайменнай назвай, прысвечаны народнаму артысту РСФСР Аляксандру Дзям'яненку з нагоды яго 85-годдзя.**



Вядомы шырокай публіцы па ролях у фільмах «Аперацыя Ы», «Каўказская палонніца», «Іван Васільевіч мяняе прафесію» і шэрагу іншых работ у кіно, у жыцці акцёр заставаўся чалавекам-таямніцай. Як прызнаваўся акцёр, калі яму дасталася роля Шурыка, то ён не адчуваў пакут творчасці, не шукаў вобраз, а проста быў сабой і дурачыўся. Але вобраз на экране атрымаўся неверагодна яркі і запамінальны. Заўсёды на здымках Дзям'яненка фантанаваў ідэямі, а пасля каманды «знята» станавіўся змрочны і задуменны. Які ж ён, сапраўдны легендарны акцёр? Як і чым жыў, каго любіў і пра што марыў? Адказы на гэтыя пытанні знойдуцца ў фільме.

«Шурык супраць Шурыка» — гэта аповед пра жыццё і творчасць вялікага артыста і ўспаміны пра яго з вуснаў родных, калег і сяброў. Вядома, ніхто з іх і з нас не ведае, што адчуваў і як пражываў сваю славу і няўдачы Аляксандр Дзям'яненка. Магчыма, пасля прагляду дакументальнага фільма мы ўбачым гэтага творчага чалавека ў іншым святле, лепш яго зразумеем, станем яшчэ больш захапляцца, але наўрад ці будзем менш любіць.

# АБ'ЯВІЛІ ПЕРАМОЖЦАЎ КОНКУРСУ «МАЛАДЫЯ ТАЛЕНТЫ БЕЛАРУСІ»

**Цырымонія ўзнагароджання пераможцаў XI Рэспубліканскага творчага радыёконкурсу «Маладыя таленты Беларусі» прайшла ў апошні дзень вясны ў Вялікай студыі Дома радыё. Па выніках трох тураў творчага спаборніцтва званне лаўрэата прысвоена 66 салістам і калектывам, а 56 фіналістаў сталі дыпламантамі праекта.**

Сярод лаўрэатаў – тры ўладальнікі Гран-пры: Лізавета Цупрык з Брэста, Ульяна Цішчанка з Магілёва і Вераніка Высоцкая з Калінкавіч былі адзначаны журы найвышэйшай узнагародай у намінацыі «Эстрадны вакал». Усяго ў фінал конкурса ў гэтым годзе выйшлі 180 удзельнікаў (салістаў і калектываў), а з пачатку спаборніцтва было пададзена 557 заявак у сямі намінацыях. У ходзе трох этапаў адбору выступленні юных артыстаў ацэньвала прафесійнае журы на чале з народным артыстам Беларусі, мастацкім кіраўніком ансамбля народнай музыкі «Бяседа» Леанідам Захлеўным.

Упершыню ў гісторыі конкурсу ў трэцім туры музыканты-салісты і акадэмічныя спевакі старэйшых узроставых катэгорый ігралі і спявалі пад акампанемент сімфанічнага аркестра Белтэлерадыёкампаніі. І па выніках лепшыя з лепшых змогуць пачуць сябе на хвалях галоўнага радыёканала краіны. Таксама прызёры творчага змагання могуць прэтэндаваць на стыпендыю Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

**Алена ДРАПКО.**

# ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 147

Сваю задачу даслаў нам Аляксандр Зелянко з Маладзечна *(гл. дыяграму)*.



**Белыя:** Крh6, Фb5, Cd4, Kd8 (4).

**Чорныя:** Крf5, пп. e5, f4 (3).

Мат за 2 хады.

Прапануем чытачам гэтую задачу для самастойнага рашэння. Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі (вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Фінішавалі першынствы Беларусі ў самых юных узроставых катэгорыях. Іх прызёрамі сталі:

хлопчыкі да 8 гадоў: 1) Ціхан Трафімчук (Брэст); 2) Ілья Казлоўскі (Гомель); 3) Кірыл Бабейкін (Мінск);

дзяўчынкі да 8 гадоў: 1) Віка Блахіна (Гродна); 2) Кіра Буланава (Брэст); 3) Сафі Ферэнец (Мінск);

хлопчыкі да 10 гадоў: 1) Дамір Булгак (Мінск); 2) Раман Дасюк (Наваполацк); 3) Саша Дрозд (Мазыр);

дзяўчынкі да 10 гадоў: 1) Ніка Венская (Мінск); 2) Саша Каспяровіч (Мінск); 3) Аліса Малюш (Гродна).

* * *

Прапануем адну з партый віцэ-чэмпіёнкі Беларусі да 20 гадоў.

Ксенія Зелянцова — Мілена Сідарэня. 1. e4 c5 2. Kf3 a6 3. c4 d6 4. d4 Cg4 5. d5 e5 6. Kc3 Kd7 7. Ce2 g6 8. 0-0 Cg7 9. Ce3 Ke7 10. Ke1 C:e2 11. Ф:e2 0-0 12. Kd3 f5 13. f4 Фc7 14. Лad1 b6 15. fe K:e5 16. Kf4 Лfe8 17. Ke6 Фd7 18. Cg5 Kf7 19. C:e7 Л:e7 20. ef gf 21. Л:f5 Лae8 22. Ke4 Kd8 23. K:g7, 1:0.

* * *

Наступную задачу склалі Леанід Макаронец, Леанід Любашэўскі (Ізраіль), Віктар Волчак (Беларусь) і Ігар Агапаў (Расія). Твор атрымаў першы прыз у конкурсе Польскай шахматнай федэрацыі.

**Белыя:** Крc1, Фg5, Лa3, Лc8, Ce6, Cg1, Kd2, Kg7, пп. c4, c6, f2, f3 (12).

**Чорныя:** Крd4, Cf1, Kb6, Kh1, пп. a6, d6, e7, f4 (8).

**Мат за 3 хады.**

Падманныя сляды: 1. Лe3? ~ 2. Kb3x, але 1...Cd3!; 1. Фa5? ~ 2. Kf5x, але 1...d5! Рашае 1. Ch2! ~ 2. C:f4 і 3. Ce3x, 2...K:c4(Kd5) 3. Фd5x; 1...Cd3 2. Kb3+! Крc3 3. Фa5x, 1...d5 2. Kf5+! Крe5 3. Лe3x, 2...Крc5 3. Ф:e7x; 1...Kg3 2. fg ~ 3. Cg1x, 1...K:f2 2. Cg1! ~ 3. C:f2x, 1...C:c4 2. C:c4! ~ 3. Ke6/Лd3x, 2...d5/Kc4 3. Ke6x; 1...Ch3 2. C:h3 ~ 3. Ke6x

* * *

Тры кампазіцыі адрасуе пачаткоўцам Сяргей Дарошчанка. Ва ўсіх — мат за 2 хады.

**№ 1**

**Белыя:** Крc5, Лa3, Лh2, Cc6, Cd8, Kb8, Kh8, пп. d2, f3, g3, h5 (11).

**Чорныя:** Крe5, Cg8, Kf8, пп. a4, b3, c4, d5, e3, e6, f5, h7 (11).

**№ 2**

**Белыя:** Крd6, Фb7, Лg1, Kb5, пп. c7, e5, e7 (7).

**Чорныя:** Крe8, Фa7, Лa8, Лb8, Cg3, пп. a6, b6, d7, f2, f4, f7 (11).

**№ 3**

**Белыя:** Крe6, Фb1, Лf2, пп. b6, e5 (5).

**Чорныя:** Крd8, Cf6, Kh8, пп. e7, g5, h2 (6).

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца 1. Лd4! ~ 2. Лh7+, 1...Лd7(Лg8) 2. Лd7. Не рашае 1. Лa4? Лa7! Правільна адказалі Фёдар Карпей, Ігар Ананіч, Віктар Жук, Уладзімір Ізотаў.

**Вадзім ЖЫЛКО.**





# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

# ПА КЛАСІЧНЫМ СЮЖЭЦЕ

**Ажыўляць на экране літаратурныя творы — справа цікавая як для рэжысёраў, так і для акцёраў. Спробы гаварыць з гледачамі сюжэтамі вядомых пісьменнікаў рабіліся неаднаразова, і сёння гэтая практыка працягваецца. Мы па-ранейшаму адсочваем у тэлепраграме фільмы, якія ў найбліжэйшы час можна будзе паглядзець на тэлеканале «Беларусь 3». І сёння хочацца звярнуць увагу на кінастужкі-юбіляры, якія якраз маюць літаратурную аснову і заклікаюць аўдыторыю да назірання за цікавымі персанажамі і іх гісторыямі.**

